КАМПЕТЭНТНА

# Агранка дыямента

## Рагнеда і Анастасія Слуцкая сустрэнуць наведвальнікаў Нацыянальнай бібліятэкі



Творы мастацтва стануць часткай унутранага аздаблення скарбніцы ведаў нашай краіны. Як адзначае дырэктар мастацкага унітарнага прадпрыемства "Скульптурны камбінат" Аляксандр Дранец, карціны, што захоўваюцца ў запасных фондах Нацыянальнага мастацкага музея, упрыгожаць прэзідэнт-цэнтр Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Прынята ўжо рашэнне, што адной з гэтых карцін стане работа знакамітага беларускага мастака Міхаіла Савіцкага. Яшчэ тры карціны з дваццаці, прапанаваных музеем, спецыялісты адбяруць у бліжэйшы час.

Манументальныя пано з выявамі гістарычных асоб беларускай зямлі аздобяць кнігасховішча. Плануецца, што такіх пано шырынёй 6 метраў і вышынёй 9 метраў будзе сем, а сярод адлюстраваных на іх волатаў айчыннай культуры будуць Кірыла Тураўскі, Васіль Цяпінскі, Янка Купала і Якуб Колас. Размесцяцца на сценах кнігасховішча таксама пейзажы з выявамі помнікаў гісторыі і культуры нашай краіны.

Па задумцы дызайнераў, што працуюць над інтэр'ерам "дыямента", афармленне першага паверха сцілабата будзе падпарадкавана тэме арветніцтва і кнігадрукавання. Прыемна здзівіць наведвальнікаў высокамастацкая калекцыя габеленаў, прысвечаная славутым жанчынам Беларусі — Анастасіі Слуцкай, Рагнедзе, Ефрасінні Полацкай...

Аліна КОТ